**А. В. Анцімонік**

# РЭАЛІЗАЦЫЯ МАСТАЦКАЙ АПАЗІЦЫІ «ЖЫЦЦЁ – СМЕРЦЬ» У ПАЭЗІІ СУЧАСНЫХ ТВОРЦАЎ СТАРЭЙШАГА ПАКАЛЕННЯ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*chornaesonca@gmail.com;*
*навук. кір. – Л. Д. Сінькова, д-р філал. навук, праф.*

У артыкуле на прыкладзе лірычнай творчасці А. Разанава, Р. Баравіковай, Я. Сіпакова, М. Стральцова, Н. Мацяш, А. Вярцінскага і Г. Каржанеўскай асэнсоўваецца спецыфіка мастацкай рэалізацыі антынамічнай пары «жыццё – смерць». Робяцца высновы пра пераважна традыцыйны падыход да яе ўвасаблення, калі лірычныя героі арыентуюцца на шлях прыняцця смерці праз высокамаральнасць і гуманізм, разглядаюць, нярэдка ў дыдактычнай манеры, гэты феномен выключна ў апазіцыі з жыццём як важнейшай каштоўнасцю і галоўным сэнсаўтваральным вобразам. Як правіла, вітальнасць, жыццесцвярджальны пафас аказваецца ў лірыцы старэйшага пакалення дамінантным, пры гэтым непасрэдна лексема «смерць» выкарыстоўваецца аўтарамі даволі рэдка.

***Ключавыя словы:*** феномен смерці; апазіцыя «жыццё – смерць»; лірычны герой; сучасная беларуская паэзія; старэйшае пакаленне паэтаў.

Для даследавання спецыфікі рэалізацыі мастацкай апазіцыі «жыццё – смерць» у паэзіі сучасных творцаў старэйшай генерацыі было абрана шэсць творцаў (гл. іерархію пакаленняў паводле А. І. Бельскага [1, с. 45–46]). З «філалагічнага» пакалення – Анатоль Вярцінскі і Янка Сіпакоў, з «сямідзясятнікаў» – Алесь Разанаў, Раіса Баравікова, Галіна Каржанеўская, Ніна Мацяш, Міхась Стральцоў. Паэзія гэтых аўтараў вылучаецца на фоне творчасці іншых пакаленняў найперш сваёй вітальнасцю, жыццё паўстае тут як сэнсаўтваральны вобраз.

Спрабуючы даць паэтычную дэфініцыю гэтаму феномену, лірычныя героі шукаюць спосабы спасціжэння сутнасці жыцця. У вершах Я. Сіпакова і А. Вярцінскага такое спасціжэнне адбываецца праз «зазямленне» і дэталізацыю анталагічных праблем, калі быццё як такое трапляе ў цалкам рэчыўную прастору: сцежкі, бары, трамваі, птушкі і да т. п. адцяняюць штодзённае жыццё, узводзячы яго менавіта да экзістэнцыйнай катэгорыі («Калі вось так лунаеш апантана…» Я. Сіпакова; «Жыццё прадаўжаецца…» А. Вярцінскага і інш.). Нездарма лірычны герой М. Стральцова, пражываючы і асэнсоўваючы быційна нетрывалы момант «тут» і «цяпер» у рэчыў-

най прасторы, асабліва моцна ўражаны існаваннем смерці, калі ёсць жыццё: «Пад гэтым небам, сінім і любімым, / Не верыцца чамусьці ў небыццё» [2, с. 437].

Рэфлексіі на тэму ўласнага існавання часам прыводзяць лірычных герояў да тэмы рэінкарнацыі («Свяціся!» Н. Мацяш; «Атава» і «Дарожныя знакі» А. Разанава; «Размова з часам» М. Стральцова): «…смерць становіцца на- / раджэннем, якое нічога не памятае пра / тое, што было перад ім» [3, с. 179]; «Не робат я, хоць і ў прысаку, тле / Стагоддзяў, – мільённая нейкая проба там» [2, с. 354]. Лірычная гераіня Р. Баравіковай параўноўвае жыццё з вечнасцю. У такім супрацьстаянні падкрэсліваецца абмежаванасць і непрацягласць у часе першага: «…жыццё ў абсягах вечных толькі прысмак, / а што ёсць смак, – ніхто мне не сказаў» [4, с. 109] (верш «Старэюць людзі, дрэвы і кусты…»). Жыццё ў Г. Каржанеўскай паўстае той сілай, якая надае навакольнаму свету хараство, а няздольнасць асобы ўбачыць гэта ўяўляецца тоеснай сну – метафарай існавання [5, с. 30] (вершы «Я гэтак гляджу…», «Вясна…», інш.); у Н. Мацяш яно выступае толькі як часовая з'ява («А ты жыві, каханы мой, жыві…», «З паўдня»), «нагода» для стомы (верш «Берагіня»). У рэшце рэшт, у тэксце «Не грымнуцца б» даецца традыцыйнае вобразнае азначэнне жыцця як рызыкоўнага шляху, які заканчваецца заўсёды аднолькава: «Жыццё – ступанне па канаце / пад зменлівым скляпеннем неба: / скульнешся ўправа, а ці ўлева – / і так, і гэтак разаб'ешся» [6, с. 277].

У моманты драматычнага асэнсавання свайго быцця паэты нярэдка звяртаюцца да катэгорыі смерці. Спецыфіка вырашэння экзістэнцыйнай праблемы скону мае, як правіла, два палярна адрозныя вектары. З аднаго боку, лірычныя героі па-філасофску ўспрымаюць непазбежнасць смерці і ўсведамляюць яе непарыўнасць з жыццём («Жыццё і смех, і тут жа – смех і смерць» паводле А. Вярцінскага [7, с. 61]), бо скон – заканамерны фінал любога апрыёры канечнага (прынамсі, фізічна) чалавечага існавання. Такія матывы асабліва заўважны ў творчасці А. Разанава («Пячора», «Свечка», «Час смерці…», «Цела – плынь…» і інш.). Дарога, якую мусіць прайсці чалавек, непазбежна заканчваецца небыццём, толькі момант памірання ў кожнага непаўторны, сцвярджае паэт.

У вершах Р. Баравіковай («Старэюць людзі, дрэвы і кусты…», «Жыву, і, дзякуй, не ў прасторы голай…» і інш.) усведамленне знітаванасці жыцця і смерці перадаецца пры дапамозе традыцыйнай антытэзы «цела/дух». Кожнае фізічнае цела мусіць памерці, аднак для бессмяротнага духу адкры-

ваецца дарога ў вечнасць, у свабоду: «Хай цела – тлен… / Ад тлену не прыбудзе, / ды вырвецца калісь на волю дух!» [4, с. 109] («Жыву, і, дзякуй, не ў прасторы голай…»). Аналагічныя матывы характэрныя і для лірычнай гераіні Н. Мацяш, якая адмаўляе страх перад смерцю (вершы «І гэты вечар…», «Свяціся!», «А ты жыві, каханы мой, жыві…», «З паўдня…» і інш.). Больш за тое, яна пераканана, што момант скону дазваляе чалавеку зразумець сваю сапраўдную існасць, што вельмі падобна да найвышэйшага спасціжэння сваёй экзістэнцыі («І гэты вечар»). Цесная сувязь і ўзаемаабумоўленасць жыцця і смерці (а гэта «раўнаісныя іпастасі» [8, с. 5], згодна з А. Разанавым) – адзін з асноўных матываў і ў лірыцы А. Вярцінскага: «Пад знакам смяротнасці сваёй жывем» [9, с. 85] (верш «Ад чаго мой сум»).

З другога боку, несправядлівасць у немагчымасці абмінуць смерць паэты пераважна вытлумачваюць падсвядомым ірацыянальным страхам перад ёю. Так, у паэтычных творах Я. Сіпакова і А. Вярцінскага з танатычнай праблематыкай вызначальным становіцца факт занепакоенасці і трывогі з прычыны канечнасці фізічнага існавання. Паводле беларускіх міфапаэтычных традыцый, скон падлеглы адмысловаму замоўчванню-табу; ён выступае ў лірыцы старэйшых творцаў праз мінімальную колькасць згадак самога слова «смерць». Вобразна асэнсоўваючы гэтую праблему, паэты як быццам адмаўляюць з'яву памірання, не вераць у канечнасць існавання. Так, патойбочны свет у разуменні лірычнага героя М. Стральцова атаясамліваецца з «новым светам» [2, с. 346], а ў адным з вершаў Я. Сіпакова прыроўніваецца да роднага дома: «– А дзе ж ваш дзед Адам? / – Памёр, дзіцятка. / <…> / Сказаў: „Ну, баба, даганяй, пайду я ўжо дамоў“» [10, с. 196] («І не абтросшы з ног дарожны пыл…»).

Такім чынам, асэнсаванне так званых «вечных» пытанняў жыцця і смерці спалучаецца ў лірыцы абраных аўтараў са скіраванасцю ў іх вырашэнні на высокую маральнасць і гуманізм. Вітальнасць, жыццесцвярджальны пафас аказваецца ў дадзеным выпадку дамінантным. Адпаведна жыццё ўсведамляецца важнейшай каштоўнасцю, часам гэтая думка набывае дыдактычны характар. У дачыненні да з'явы смерці паэты альбо ідуць па шляху стаічнага яе прыняцця, альбо адмаўляюцца разумець яе мэтазгоднасць, пераносяць акцэнт на ірацыянальны страх перад сконам. Апазіцыя «жыццё – смерць» можа ўвасабляцца пры дапамозе традыцыйнай антытэзы «цела – дух», што суправаджаецца матывамі неўміручасці духу і метэмпсіхозу, а таксама пры дапамозе матываў узаемаабумоўленасці

разглядаемых феноменаў. Пры гэтым сама лексема «смерць», у адпаведнасці з паводлефальклорнай традыцыяй, згадваецца творцамі даволі рэдка.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Бельскі А. І.* Паэзія // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. Мінск : Бел. навука, 2003. С. 39–87.
2. *Стральцоў М.* Выбранае : Проза, паэзія, эсэ / [Прадм. А. Адамовіча]. Мінск : Маст. літ., 1987.
3. *Разанаў А.* На гэтай зямлі. Вільня : Логвінаў, 2015.
4. *Баравікова Р.* Дрэва для райскай птушкі: лірыка. Мінск: Маст. літ., 2007.
5. *Каржанеўская Г.* Асенні мёд : вершы розных гадоў. URL: http://kamunikat.org /usie_knihi. html?pubid=18267 (дата звароту: 23.03.2017).
6. *Мацяш Н.* Выбраныя творы. Мінск : Беларуская навука, 2015.
7. *Вярцінскі А.* Тым часам… : вершы, эсэ, публіцыстыка. Мінск : Кнігазбор, 2020.
8. *Разанаў А.* Гліна Камень Жалеза. Мінск : І. П. Логвінаў, 2013.
9. *Вярцінскі А.* Жыцьмем : вершы і паэмы. Мінск : Кнігазбор, 2012.
10. *Сіпакоў Я.* Вочы ў вочы : выбраная паэзія. Мінск : Маст. літ., 1978.